# ДЫСБАЛАНС КАШТОУНАСЦЕЙ
# У КАНСТЫТУЦЫ1 3 МАЯ 1791 г.

**Д. В. Шчэрбш**

*Полацю дзяржауны утвератэт*

На сучасным этапе развщця грамадства вялшая увага надаецца сацыяльнай эфектыунасці нарматыуных прававых актау. Вялікае значэнне для яе забеспячэння мае щэалапчная несупярэчлівасць прававых актау. Яна з'яуляецца важным фактарам для забеспячэння свядомага і добраахвотнага іх выканання насельніцтвам.

Гісторыя прыводзіць шматл^я прыклады нарматыуных дакументау, яшя з'яулял^я вынікам ідэалагічнай барацьбы у грамадстве і з-за сваёй каштоунаснай супярэчлівасці прыводзілі да далейшых сацыяльных канфліктау. Адным з падобных прыкладау з'яуляецца Канстытуцыя Рэчы Паспалгтай 3 мая 1791 г.

З канца XVI ст. Рэч Паспалгтая паступова пачынае прыходзіць у заняпад. Шматл^я войны прывялі да эканамічнага заняпаду яе эканоміку, яш суправаджауся палітычным крызісам. Шырокія паунамоцтвы караля з-за усеуладдзя шляхты фактычна не рэалізоУваліся ім самастойна. «Liberum veto» у сваю чаргу паралЬ завала дзейнасць Сейма. Кіраванне крашай перайшло да мясцовых органау, яшя знаходзШся пад уплывам розных магнацшх груповак і запаунялі унутрыпалітычнае жыццё дзяржавы міжусобіцамі і сутыкненнямі.

Статус сялян і гараджан трактавауся як непал^ычны, ім поунасцю адмаулялася у праве на удзел у фарміраванні органау кіравання. Яскравай праявай культу шляхецтва і яе роУнасці стала увядзенне у 1589 г. прынцыпу аднагалосся пры прыняцці саймавых пастаноу («liberum veto»). Пашырэнне уплыву шляхты прывяло да распаусюджання поглядау на дагаворную прыроду адносін паміж шляхтай і каралеускай уладай. Шляхецшя свабоды трактавал^я як спрадвечныя.

Сярод пануючага класа склалася перакананне аб дасканаласщ дзяржаунага ладу Рэчы Паспал^ай. Яно лічылася прыкладам найлепшай формы шравання - змешанай, якая гарантуе сапраудны росккв^ свабоды. Любыя змяненні большая частка шляхты

адмауляла, лічыла шкоднымі. Альтэрнатыуныя дамінуючай сармацкай ідэалогіі погляды у Рэчы Паспал^ай доУгі час не успрымаліся. Аднак пасля стабілізацыі міжнародных сувязяу усярэдзіне XVIII ст., яшя паскорыги эканамічнае адраджэнне дзяржавы, у Рэч Паспалгтую з Заходняй Еуропы пачынаецца пранікненне асветнщкай щэалогп.

Пад яе уплывам пашыраюцца антыпрыгоннщшя ідэі, расце колькасць прыхільнікау рэфармавання грамадства на новых буржуазна-дэмакратычных асновах. Яны жорстка крытыкуюць саслоуныя парадш «шляхецкай анархіі», бясправуе значнай часткі насельніцтва, юрыдычную непісьменнасць службоуцау і суддзяу і вылучаюць прапановы па рэфармаванні дзяржавы на прынцыпах рацыянальнасці, замацаванні натуральных правоу і свабод.

У кастрычніку 1788 г. сабрауся чарговы Сейм Рэчы Паспалгтай, названы пазней Чатырохгадовым. Рэформы падсумавала Канстытуцыя, прынятая 3 мая 1791 г. Аб вастрыш щэалапчнага канфлшту у грамадстве сведчыць і сам парадак прыняцця Канстытуцып. Так, лідары прагрэсіунай плыні вырашы^ прадставіць яе Сейму, скарыстаушы пры гэтым даволі спрыяльны час - адразу пасля велшодных канікул, калі большая частка кансерватарау не паспела яшчэ з'ехацца у Варшаву. Праект Канстытуцып дэпутатам не раздавауся, а быу зачытаны сакратаром, нягледзячы на пратэсты апазіцыі [1, с. 37]. Сам кароль выступау за праект тройчы. Не вытрымаушы такога щску, адзін з кансерватыуных дэпутатау узяу за руку маленькага сына, якога ён прывёу з сабой, закрычау: «Я заб'ю сваё дзщя... каб яно не дажыло да нявол^ каторую рыхтуе гэты праект» [1, с. 37]. Гэты жэст не аказау шякага уплыву. Канстытуцыя была прынята.

Наяунасць моцнай кансерватыунай партыі, неспрыяльны рэформам міжнародны уплыу суседшх дзяржау, непадрыхтаванасць значнай часткі грамадства да змен перашкаджалі правядзенню рэформ, прывялі да непаслядоУнасці змен, щэалапчнай супярэчлівасці Канстытуцыі. Так, у вобласщ прававога становішча жыхароу Рэчы Паспалгтай абвяшчауся прынцып усеагульнасщ грамадзянства, усе жыхары складалі «народ». Аднак адзіным артыкулам Канстытуцып, дзе пад народам разумелся усе грамадзяне, быу арт. 11, яш называуся «Народныя узброеныя сілы» [1, с. 111]. Усеагульнасць грамадзянства спалучалася з саслоунай няроунасцю

грамадзян. Так, прызнаючы ролю сялянства у складанш «найбольшых багаццяу крашы», аб'яуляючы іх вольнымі грамадзянамі, арт. 4 Канстытуцып не надавау ім права вольнага заключэння дамовау з памешчыкамі і свабоды сыходу ад іх [1, с. 96-98]. Сялянам толькі гарантавалася апека дзяржавы у забеспячэнні узаемнасці абавязкау па дамовах з памешчыкамі і немагчымасць апошнімі іх парушыць.

Правы мяшчан і шляхты паступова УраУноУваліся, але злщця саслоуяу у палітычных правах не адбылося. У адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі Пасольская ізба складалася з 204 дэпутатау, абраных на шляхецкіх сейміках, і 24 прадстаушкоу гарадоу, абраных на акруговых зборах, з правам вырашальнага голасу па пытаннях гарадоу, дарадчым па пытаннях гандлю і прамысловасці. Законам аб гарадах, яш стау неад'емнай часткай Канстытуцып, мяшчанам дазвалялася займаць шжэйшыя пасады у дзяржауных установах і судах, працаваць у якасщ адвакатау і, самае галоунае, набываць маёнткі, населеныя залежнымі сялянамі, што у выпадку іх кошту звыш 2 тыс. злотых давала права хадайнщтва аб уводзшах у шляхецкае саслоуе. На мяшчан распаусюджвал^я такія ж правы асаб^тай недатыкальнасці, свабоды слова і друку, як і на шляхту [2]. У той жа час закон распаусюджвауся тольш на каралеусшя гарады.

Канстытуцыя дэкларавала непадзельнасць, суверэштэт і незалежнасць крашы, вяршэнства закона, свабоду веравызнанняу, але пры дамшаванш каталіцкай царквы. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. дзейшчала невял^ час. Супраць рэформ паустала кансерватыуная арыстакратыя, якая звярнулася за ваеннай дапамогай да суседшх дзяржау. Гэта прывяло да акупацыі крашы войскамі замежных дзяржау, адмены Канстытуцып, а потым да другога падзелу Рэчы Паспалгтай.

### Л1таратура


1. Konstytycja 3 maja 1791 // Konstytycja 3 maja 1791. Opvacowal Jerzy Kowecki. - Warszawa, 1991. - S. 91-119.

2. Miasta nasze krolewskie wolne w panstwach Rzeczypospolitej // Konstytycja 3 maja 1791. Opracowal Jerzy Kowecki. - Warszawa, 1991. - S. 121-135.